Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04

DOI:10.17951/sb.2021.15.349-362
Studia Białorutenistyczne 15/2021 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Yury Charnyakievich / Юрый Чарнякевіч

Belarussian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk (Belarus)
e-mail: czarn@tut.by
https://orcid.org/0000-0002-9136-7814

# Адметныя лексемы, звязаныя з сельскай і хатняй гаспадаркай (на прыкладзе гаворак Брэсцкай вобласці)

*Distinctive Lexemes which are Related to Agriculture and the Household (In the Dialects of the Brest Region)*

*Charakterystyczne leksemy związane z rolnictwem i gospodarstwem domowym (na przykładzie gwar obwodu brzeskiego)*

UMCS

**Abstract**

Field research conducted in the Brest region of Belarus reveals many synonyms in dialect vocabulary related to agriculture and the household (this is the most ancient and archaic vocabulary). But many lexical facts that exist in the speeches of the Brest region of Belarus have not been introduced into scientific use, therefore, the attention of researchers to this topic is not accidental. The most obvious distribution of lexical facts can be shown by regional linguistic geography. Therefore, the article contains linguistic maps based on the analysis of numerous linguistic materials recorded by the author himself in about 70 rural settlements of the Brest region. Distinctive lexemes, which are introduced into scientific use for the first time, once again confirm the conclusions of previous researchers about the linguistic richness of the studied region (and the whole Polesie) and can significantly expand the factual basis of Slavic dialectology.

**Keywords:** dialectology, linguistic geography, atlas, map, Brest region

**Abstrakt**

Badania terenowe przeprowadzone w obwodzie brzeskim na Białorusi ujawniają wiele synonimów w słownictwie gwarowym związanym z rolnictwem i gospodarstwem domowym (jest to słownictwo najstarsze i najbardziej archaiczne). Tym niemniej do tej pory wiele faktów

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



leksykalnych, które funkcjonują w codziennej komunikacji mieszkańców obwodu brzeskiego, nie zostało wprowadzone do obiegu naukowego, nie przypadkowo więc badacze kierują uwagę do tak tematycznie zakrojonego słownictwa. Rozpowszechnienie jednostek leksykalnych najbardziej obrazowo można przedstawić za pomocą regionalnej geografii językowej. Dlatego w artykule zamieszczono mapy językowe sporządzone na podstawie analizy licznych materiałów odnotowanych osobiście przez autora w około 70 osadach wiejskich obwodu brzeskiego. Wyróżniające się leksemy, które po raz pierwszy zostają wprowadzone do użytku naukowego w tym artykule, ponownie potwierdzają wnioski innych badaczy o bogactwie językowym badanego regionu (i całego Polesia), z pewnością mogą znacznie poszerzyć podstawę materiałową dialektologii słowiańskiej.

**Słowy kluczowe:** dialektologia, geografia językowa, atlas, mapa, obwód brzeski

**Анатацыя**

Палявыя даследаванні, праведзеныя на тэрыторыі Брэсцкай вобласці Беларусі, дазваляюць выявіць шматлікія сінонімы ў дыялектнай лексіцы, звязанай з сельскай і хатняй гаспадаркай (гэта найбольш старажытная і архаічная лексіка). Але да сёння многія лексічныя факты, што бытуюць у гаворках Брэсцкай вобласці Беларусі, не ўведзены ў навуковы зварот, таму ўвага даследчыкаў да гэтай тэмы – невыпадковая. Найбольш наглядна пашырэнне лексічных фактаў можна паказаць з дапамогай рэгіянальнай лінгвагеаграфіі. Таму ў артыкуле змешчаны лінгвістычныя карты, зробленыя на падставе аналізу шматлікага моўнага матэрыялу, запісанага прыкладна ў 70 вясковых паселішчах Брэсцкай вобласці асабіста аўтарам. Адметныя лексемы, якія ўводзяцца ў навуковы ўжытак упершыню, яшчэ раз пацвярджаюць высновы ранейшых даследчыкаў пра моўнае багацце даследаванага рэгіёна (ды і ўсяго Палесся) і могуць значна пашырыць фактгалагічную базу славянскай дыялекталагічнай навукі.

**Ключавыя словы**: дыялекталогія, лінгвагеаграфія, атлас, карта, Брэсцкая вобласць

Нягледзячы на значную папярэднюю працу як айчынных, так і замежных дыялектолагаў, многія лексічныя факты, што бытуюць у гаворках Беларусі, яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў. Палявыя экспедыцыі і сёння дазваляюць выявіць значныя сінанімічныя рады ў тых або іншых пластах дыялектнай лексікі, а таксама ўвесці новыя, раней не адзначаныя даследчыкамі, словы ў навуковы ўжытак. Асабліва цікавымі для даследавання з'яўляюцца гаворкі Брэсцкай вобласці Беларусі, дзе захавалася вялікая колькасць моўных архаічных асаблівасцей. Акрамя таго, заходнепалескія гаворкі, распаўсюджаныя на тэрыторыі Брэстчыны, паводле беларускага дыялектолага Аляксандра Крывіцкага, з'яўляюцца „часткай дыялекту беларуска-ўкраінскага нацыянальнага сумежжа" (Kryvìckì, 1994, s. 415). Такія рэгіёны, як правіла, характарызуюцца разнастайнымі дыялектнымі ўзаемаўплывамі і адметнымі гібрыднымі з'явамі, а таму ўяўляюць асаблівую цікавасць для даследчыкаў, прычым як айчынных, так і замежных.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



Акрамя таго, усходняя і паўночная часткі Брэсцкай вобласці з'яўляюцца перыферыйнымі ў адносінах да слуцка-мазырскіх і сярэднебеларускіх гаворак адпаведна. Менавіта на такіх памежных тэрыторыях можна найбольш выразна прадэманстраваць арэальную дыферэнцыяцыю фанетычных і марфалагічных адметнасцей, абазначыць арэалы пашырэння тых або іншых лексічных адзінак, а таксама выявіць некаторыя ўніверсальныя заканамернасці міждыялектнай інтэрферэнцыі і архаічныя моўныя формы.

Па гэтых і некаторых іншых прычынах вывучэнне асаблівасцей функцыянавання дыялектнай лексікі, звязанай з сельскай і хатняй гаспадаркай, у гаворках Брэсцкай вобласці Беларусі мае важнае значэнне не толькі для беларускай, украінскай ці польскай, але і для ўсёй славянскай лінгвістыкі.

Прыведзеныя моўныя факты выяўлены асабіста аўтарам прыкладна ў 70 вясковых паселішчах падчас палявых даследаванняў на працягу 2005–2020 гг. Дыялектныя словы прыводзяцца курсівам, у спрошчанай транскрыпцыі, з абазначэннем націску, а таксама з пазначэннем некаторых фанетычных працэсаў у галіне кансанантызму (напрыклад, наяўнасць або адсутнасць няпоўнай рэгрэсіўнай асіміляцыі зычных па глухасці).

Як правіла, намі даследавалася маўленне жыхароў старэйшага пакалення ва ўзросце прыкладна ад 70 да 85 гадоў. Пераважна інфарматарамі былі жанчыны, якія пражылі ў вёсцы ўсё сваё жыццё (тут нарадзіліся, выйшлі замуж) і звычайна не маюць сярэдняй адукацыі (скончылі 3–4 класы польскай школы).

У артыкуле змешчаны таксама і карты (усяго 6 ілюстрацыйных малюнкаў), якія досыць яскрава паказваюць пашырэнне тых або іншых моўных з'яў у шэрагу гаворак Брэсцкай вобласці. Акрамя таго, вызначаюцца арэалы пашырэння згаданых у артыкуле лексем у гаворках усёй Беларусі і, у некаторых выпадках, у суседніх гаворках Польшчы і Украіны. Для гэтага ў артыкуле былі выкарыстаны такія лінгвагеаграфічныя працы як *Лексічны атлас беларускіх народных гаворак* (*Leksìčny atlas…,* 1993–1998), *Атлас українскай мовы* (*Atlas ukraïns'koï movi…,* 1984–2001), *Лексични атлас правобережного Полісся* (Nikončuk, 1994) і *Atlas gwar polskich i ukraińskich okolic Włodawy* Фелікса Чыжэўскага (Czyżewski, 1986).

## Лексемы, звязаныя з хатняй гаспадаркай

Месца ў печы, дзе гараць дровы (*под*), у гаворках жыхароў Брэсцкай вобласці пераважна называецца *чарэ́н'(чарэ́н, чаро́н)*. Часам гэтай назве супрацьпастаўляецца найменне *ток*, а таксама слова *под* (Čarnâkevìč, 2009, m. 308).

Згодна з ранейшымі агульнарэспубліканскімі даследаваннямі, літаратурная форма *под* характэрна гаворкам жыхароў усёй Беларусі, акрамя поўдня і паўднёвага захаду рэспублікі. Лексема *чарэ́н' (чарэ́н, чаро́н)* зафіксавана на поўдні краіны, а *ток* – на захадзе і на паўднёвым захадзе Беларусі (*Leksìčny*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04






*atlas…*, 1993–1998, t. 4, m. 80). Паводле Лены Леванцэвіч, лексема *чарэ́н’* бытуе ў большасці гаворак жыхароў Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці (Levancèvìč, 1993–2001, *Leksìka*, m. 56). Гэтыя моўныя факты пацвярджаюцца і нашымі запісамі, зробленымі падчас нядаўніх палявых даследаванняў.

Найменне карніза (выступу на коміне) *прыму́рак (прыму́рок)* у гаворках Брэсцкай вобласці адзначана ў асноўным на тэрыторыі Бярозаўскага, Пінскага, Івацэвіцкага раёнаў. Таксама ў гаворках Брэстчыны шырока распаўсюджана



Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



лексема *кам’інóк (кóм’інак),* а найменне *каптýр* ужываецца значна радзей (Čarnâkevìč, 2009, m. 312].

Згодна з агульнарэспубліканскімі даследаваннямі, назва *прымýрак* адзначана як на поўдні краіны, так і на захадзе і ў цэнтры Беларусі. Лексема *кам’інóк,* якая паводле паходжання з’яўляецца лацінізмам, запазычаным з польскай мовы (Stankevìč, 1997, s. 34), зафіксавана ў паўднёва-заходняй частцы рэспублікі і на захадзе (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 4, m. 86). Як вынікае з карты 312 *Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*, у маўленні мясцовых жыхароў і сёння для наймення карніза (выступу на коміне) шырока ўжываюцца лексемы *прымýрак* і *кам’інóк (кóм’інак)*.

Акрамя таго, сярод адзінкавых назваў гэтай рэаліі, у в. Меляхі Ляхавіцкага раёна намі было запісана такое слова, як *л’íштвачка*. Гэтая назва не фіксавалася ранейшымі даследаваннямі і ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.

На большай частцы Брэсцкай вобласці ткацкі станок (*ставы*) называецца *в’арстáт (в’арстáц’, в’эрстáц’, вэрстáт’)*. Адзначым таксама, што ў в. Плехаўшчына Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці намі быў зафіксаваны фанетычны варыянт гэтай лексемы – *в’эрстáк.* У гаворках Брэсцкай вобласці ткацкі станок называюць таксама *крóсна* або *стáў*. Згодна з ранейшымі даследаваннямі, назва *в’арстáт* фіксуецца пераважна ў маўленні жыхароў заходняй Беларусі, а лексема *крóсна* адзначана на захадзе і (радзей) на ўсходзе краіны. Слова *стаў* распаўсюджана на поўначы і паўднёвым захадзе рэспублікі (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 4, m. 167; Čarnâkevìč, 2009, m. 319).

Для наймення палавіка ў большасці гаворак Брэсцкай вобласці выкарыстоўваецца літаратурная назва *палав’íк (полов’íк)*. Шырока ў гэтым значэнні ўжываецца таксама лексема *хóдн’ік* або *хóднык*. Сярод адзінкавых найменняў намі былі зафіксаваны словы *полотн’íк, латныќ, палаўн’íк* (Čarnâkevìč, 2009, m. 320).

Як вядома, лексема *палав’íк* шырока распаўсюджана на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва ў цэнтры і на ўсходзе рэспублікі. Назва *хóдн’ік* ужываецца пераважна на захадзе краіны. Слова *пылатн’íк (пылытн’íк)* рэдкаўжывальнае і адзначана ў асобных гаворках жыхароў Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці і Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 4, m. 198). Такім чынам, словы *полотн’íк, палаўн’íк* (і яго форма *латныќ*) збіральнікамі *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак* на тэрыторыі Івацэвіцкага, Баранавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці не фіксавалася і адзначана падчас палявых даследаванняў упершыню.

Калыска, якую бралі з сабой на поле, называецца ў гаворках Брэстчыны *калуб’э́л’* (*колуб’э́л’, кал’уб’э́л’, калыб’э́л’, колыб’э́л’, кал’бэ́л’*), а ў некаторых гаворках адзначана пашырэнне лексем *калы́ска* і *лýпка* (апошняя даволі часта фіксуецца ў наваколлях г. Івацэвічы) (Čarnâkevìč, 2009, m. 299).

Слова *калы́ска* адзначаецца, згодна з агульнарэспубліканскімі даследаваннямі, на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва ў цэнтральнай яе частцы. Лексема *калыб’э́л’* сустракаецца пераважна на захадзе рэспублікі, а *луб’áнка* (*лýпка*) – у паасобных

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04






гаворках заходняй часткі краіны (*Leksìčny atlas*..., 1993–1998, t. 4, m. 179). Як ілюструе карта 312 *Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*, у маўленні мясцовых жыхароў і сёння для наймення калыскі, якую бралі з сабой на поле, шырока ўжываюцца словы *калуб'э́л'* (*колуб'э́л', кал'уб'э́л', калыб'э́л', колыб'э́л', кал'бэ́л'*) і *калы́ска.* Адметнай з'яўляецца і лексема *лу́пка,* зафіксаваная падчас палявых экспедыцый пераважна ў Івацэвіцкім раёне. Згодна з тлумачальнымі слоўнікамі, *луб'а́нкай* (*лу́пкай*) называюць ручны кораб з дубу, бярозы для захоўвання, пераноскі, упакоўкі чаго-небудзь. Але ж, як вынікае з сабранага намі матэрыялу, у *лу́пку* маглі класці і насіць з сабою на поле не толькі што-небудзь, а і каго-небудзь (малое дзіця).

Адзначым таксама, што ў в.Святая Воля Івацэвіцкага раёна ў якасці назвы падобнай рэаліі намі была зафіксавана лексема *кошэ́л'*. Ранейшымі даследаваннямі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці падобная словаформа не адзначалася і, такім чынам, упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак.

Назва сальніцы на тэрыторыі Брэсцкай вобласці Беларусі супадае з літаратурнай нормай: *сал'н'і́ца (сол'н'і́ца)*. Лексема *сал'а́нка (сол'а́нка)* адзначана пераважна ў гаворках, распаўсюджаных на тэрыторыі Бярозаўскага, Пінскага, Івацэвіцкага раёнаў (Čarnâkevìč, 2009, m. 344). Як сведчаць ранейшыя агульнарэспубліканскія даследаванні, лексема *сал'н'і́ца* ўласціва гаворкам жыхароў на захадзе Беларусі. Назва *сал'а́нка* зафіксавана на ўсёй тэрыторыі рэспублікі, аднак найбольш паслядоўна названая лексема ўжываецца на ўсходзе і ў цэнтры краіны (*Leksìčny atlas*..., 1993–1998, t. 5, m. 306).

Днушка (невялікая) у гаворках жыхароў Брэсцкай вобласці называецца звычайна *кружо́к*. Словаформа *стал'н'і́ца* адзначана радзей, а *до́шка* – толькі ў некаторых гаворках Брэстчыны (Čarnâkevìč, 2009, m. 343). Назва *кружо́к*, як

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



сведчаць ранейшыя даследаванні, характэрна для гаворак жыхароў поўдня і захаду Беларусі, лексема *стал'н'íца* пашырана на захадзе і ў некаторых гаворках усходу рэспублікі, а слова *дóшка (дóшчачка)* адзначана на ўсёй тэрыторыі краіны, часта побач з назвамі *стал'н'íца* і *кружóк* (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 5, m. 304).

Месца, дзе сякуць дровы, у гаворках Брэсцкай вобласці звычайна называецца *дрывóтн'а* (*дравóтн'а, дровóтн'а, дров'íтн'а*). Словаформа *дрывóтн'ік* фіксавалася намі значна радзей (Čarnâkevìč, 2009, m. 203). Паводле матэрыялаў ранейшых агульнарэспубліканскіх даследаванняў, лексема *дрывóтн'а* пашырана на большай частцы тэрыторыі Беларусі, а словаформа *дрывóтн'ік* – на захадзе і ў цэнтральных раёнах краіны (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 1, m. 201).

Як вядома, пры запісе дыялектнага матэрыялу варта звяртаць увагу і на этналінгвістычныя факты. Так, у многіх гаворках Брэстчыны свята з нагоды засялення ў новую хату называецца *ўхóдз'іны*. Разам з тым, у арэале гаворак на тэрыторыі Бярозаўскага, Пінскага, Івацэвіцкага раёнаў даволі часта адзначаюцца лексемы *ўхóшчына (ухóдчына, ухэ́шчына)* і *ўлáз'іны*. Першая з іх зафіксавана ў наваколлях Выганаўскага возера (вв. Выганашчы, Гутка, Рудня Івацэвіцкага раёна і в. Сакалоўка Пінскага раёна) і ў Бярозаўскім раёне (вв. Сакалова, Плехаўшчына), а другая – толькі ў трох гаворках Івацэвіцкага раёна (вв. Аброва, Святая Воля, Козікі) (Čarnâkevìč, 2009, m. 302). Назва *ўхóдз'іны* вядома гаворкам жыхароў цэнтральнай і заходняй Беларусі. Лексема *ўхóшчына* распаўсюджана ў паўднёва-заходняй частцы краіны, а *ўлáз'іны* лакалізуецца на ўсходзе, паўднёвым усходзе і, зрэдку, на поўдні рэспублікі (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 3, m. 271). Паводле Л. Леванцэвіч, лексема *ўхóдз'іны* фіксуецца на поўначы Бярозаўскага раёна, а ва ўсіх іншых гаворках жыхароў гэтага рэгіёна ўжываецца назва *ўхóдчына* (Levancèvìč, 1993–2001, *Leksika*, m. 78), што пацвярджаецца і нашымі запісамі, зробленымі падчас нядаўніх палявых даследаванняў.

## Некаторыя лексемы, звязаныя з сельскай гаспадаркай

Радоўка пастуха амаль на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай вобласці называецца *вóчарадз' (óчэрэдз')*. У гаворках жыхароў Баранавіцкага, Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў падобная рэалія мае назвы або *кал'э́йка*, або *чаргá* (Čarnâkevìč, 2009, m. 185). Як сведчаць ранейшыя агульнарэспубліканскія даследаванні, назва *вóчарадз'* шырока бытуе на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а лексема *кал'э́йка* зафіксавана толькі на захадзе і паўднёвым захадзе рэспублікі. Слова *чаргá* ўжываецца пераважна ў цэнтральнай частцы краіны (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 1, m. 64).

У гаворках мясцовых жыхароў Брэсцкай вобласці Беларусі ў словазлучэнні *красуе жыта* ўжываецца літаратурная форма *красýйэ*. Толькі ў некаторых гаворках Брэсцкай вобласці зафіксаваны варыянт *расýйэ* (Čarnâkevìč, 2009, m. 248). Як сведчаць вынікі ранейшых навуковых даследаванняў, лексема *красýйэ* адзначана амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а *расýйэ* ўжываецца звычайна

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



ў гаворках жыхароў заходняй часткі краіны (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 2, m. 161). Згодна з атласам *Лексіка гаворак Беларускага Прыпяцкага Палесся*, лексема *красавацца (красаваць)* у значэнні ‘назвы працэсу красавання збожжа’ адзначана ў цэнтральнай і ўсходняй частцы Палесся, а слова *расавацца (расіцца)* – пераважна ў наваколлях Пружанаў і Бярозы (Veštart, 2008, m. 52), што пацвярджаецца і нашымі данымі, атрыманымі падчас экспедыцый у розныя раёны Брэсцкай вобласці. Разам з тым, паводле матэрыялаў *Атласа ўкраінскай мовы*, у адзінкавых паселішчах Брэстчыны (у паўднёва-заходняй яе частцы) сустракаецца лексема *кв’іту́е*, якая пашырана і ў суседніх гаворках Валынскай і Ровенскай абласцей Украіны (*Atlas ukraïns'koï movi…,* 1984–2001, t. 2, m. 120).

Адзначым таксама, што ў Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці (у в. Дабромысль) для назвы гэтай рэаліі намі было зафіксавана слова *рысу́е*. Падобная лексема на гэтай тэрыторыі раней не фіксавалася.

Сярод палявых работ важнае месца для земляробаў займае сенакос. У гаворках Брэсцкай вобласці ‘час кашэння травы на сена’ атрымаў наступныя назвы: *с’энако́с (с’эноко́с, с’іноко́с), каз’ба́ (коз’ба́), касав’і́ца (косов’і́ца, косовы́ц’а).* Слова *с’энако́с (с’эноко́с, с’іноко́с)* фіксуецца ў гаворках Івацэвіцкага і Пінскага раёнаў, а ў маўленні жыхароў Ляхавіцкага і Баранавіцкага раёнаў пераважае лексема *каз’ба́.* Словаформа *косов’і́ца* бытуе, пераважна, у арэале гаворак з оканнем, г.зн. Івацэвіцкага, Бярозаўскага і Ганцавіцкага раёнаў (Čarnâkevìč, 2009, m. 263). Як вынікае з ранейшых агульнарэспубліканскіх даследаванняў, слова *каз’ба́* пашырана амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, як і лексема *с’энако́с*, якая адзначана збіральнікамі гаворак значна радзей і, іншы раз, побач са словам *каз’ба́*. І толькі на самым поўдні Беларусі, пераважна ў арэале гаворак з оканнем, адзначаецца слова *касав’і́ца (косов’і́ца, косовы́ц’а)* (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 2, m. 248).

Заўважым таксама, што, згодна з картай 263 *Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*, лексема *с’энако́с (с’іноко́с)* значна пашырылася ў гаворках Івацэвіцкага, Ляхавіцкага, Пінскага, Баранавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці. Раней у гэтых гаворках адзначаліся пераважна словы *касав’і́ца (косов’і́ца)* і *каз’ба́* (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 2, m. 248). Магчыма, пашырэнне лексемы *с’энако́с (с’іноко́с)* звязана з уплывам на маўленне мясцовых жыхароў літаратурнай беларускай мовы. Да таго ж, і паводле матэрыялаў *Атласа ўкраінскай мовы* ў гаворках Брэсцкай вобласці часам адзначаецца слова *с’іноко́с* (у в. Гарадзец Кобрынскага раёна, вв. Ахова, Галева, Дабраслаўка Пінскага раёна, в. Семігосцічы Столінскага раёна), хоць, згодна з данымі ўкраінскіх дыялектолагаў, на гэтай тэрыторыі найбольш ужывальнай з’яўляецца лексема *косовы́ц’а* (*Atlas ukraïns'koï movi…,* 1984–2001, t. 2, m. 317). Карыстаючыся толькі адным гэтым прыкладам можна паказаць, што карты рэгіянальнага *Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны* і *Атласа ўкраінскай мовы*, якія маюць даволі густую сетку апорных населеных пунктаў на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, значна ўдакладняюць даныя, атрыманыя збіральнікамі *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак*.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



Адзначым таксама, што лексема *с'інокóс* вядома і жыхарам Валынскай і Ровенскай абласцей Украіны (праўда, ужываецца яна значна радзей за агульнапашыраную на гэтых абшарах словаформу *косовы́ц'а)*. Лексема *к'із'бá* на тэрыторыі Валынскай і Ровенскай абласцей Украіны сустракаецца ў адзінкавых выпадках (*Atlas ukraïns'koï movi…,* 1984–2001, t. 2, m. 317).

'Рад скошанай травы' амаль на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай вобласці Беларусі называецца *пакóс*. Слова *пракóс* фіксавалася намі значна радзей і толькі ў арэале гаворак на тэрыторыі Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў, а лексема *рад* – пераважна ў гаворках Пінскага, Івацэвіцкага і Ганцавіцкага раёнаў (Čarnâkevìč, 2009, m. 264).




Літаратурная форма *пракóс* характэрна, як сведчаць ранейшыя даследаванні, для гаворак усіх жыхароў Беларусі, а назва *пакóс* ужываецца на поўдні і ўсходзе рэспублікі. Слова *рад* зафіксавана ў некаторых раёнах Брэсцкай вобласці (Бярозаўскі, Пінскі) (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 2, m. 249). Гэтыя моўныя факты пацвярджаюцца і нашымі запісамі, зробленымі падчас нядаўніх палявых даследаванняў.

Варта таксама заўважыць, што ў адзінкавых выпадках намі былі зафіксаваны словаформы, якія на гэтай тэрыторыі раней не адзначаліся. Так, у в. Боркі Ганцавіцкага раёна падобная рэалія называецца *вал*, а ў в. Рудня Івацэвіцкага раёна – *градóк*. Такім чынам, гэтыя лексемы ў навуковым дыялекталагічным ужытку таксама з'яўляюцца новым здабыткам.

'Старая няскошаная трава, якая застаецца на полі пасля сенакосу', на Брэстчыне называецца *в'іш*. Часам фіксуецца таксама лексема *в'ішáр*, а яшчэ радзей – *в'ішэ́й*. Словаформа *в'ішáк* адзначана толькі ў адзінкавых выпадках (вв.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



Няхачава і Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці) і кампактнага арэалу не ўтварае (Čarnâkevìč, 2009, m. 215).




Варта звярнуць увагу, што лексема *в’іш* (і яе варыянты) ‘старая няскошаная трава’ пашырана, як сведчаць ранейшыя даследаванні, толькі на поўдні Беларусі, у гаворках Брэсцкай і Гомельскай абласцей, а таксама ў паўднёвых частках Гродзенскай і Мінскай абласцей. Назва *в’іш* распаўсюджана ў маўленні жыхароў цэнтральнага Палесся, а словаформы *в’ішэ́й* і *в’ішáр* адзначаны пераважна ў паўднёва-заходняй частцы Беларусі (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 1, m. 278).

Лексема *в’ішáр* фіксуецца таксама сучаснымі даследчыкамі ў в. Белавуша Столінскага раёна (Sen′kavec, 2011, s. 110), а найменне *вышэ́й* – у в. Горталь Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці (Klìmčuk ì Âškìn, 1976, s. 78). Па даных Любові Шаталавай, слова *в’іш* бытуе ў маўленні жыхароў Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці і Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці, а лексема *в’ішáр* – у Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці (Šatalava, 1975, s. 30). Гэта адназначна сведчыць, што лексема *в’ішáк* на тэрыторыі Брэсцкай вобласці раней дыялектолагамі не адзначалася і зафіксавана падчас нашых палявых даследаванняў упершыню.

Са скошаных і высушаных траў, як вядома, пазней сяляне ставілі вялікія стагі сена. Так, ‘капа сена’ на большай частцы Брэсцкай вобласці называецца *кап’íца*. Літаратурная форма *капá* ўжываецца ў гаворках рэгіёна значна радзей, а *кóпка* – вельмі рэдка (Čarnâkevìč, 2009, m. 266).

Назва *кап’íца*, як сведчаць папярэднія дыялекталагічныя даследаванні, пашырана на паўднёвым захадзе Беларусі. Лексема *капá* адзначана ў большасці

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04






беларускіх гаворак, а форма *ко́пка* – на паўночным захадзе і (рэдка) на захадзе рэспублікі (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 2, m. 257). На Пружаншчыне лексема *кап'і́ца (коп'і́ца, копы́ца)* ужываецца амаль ва ўсіх гаворках жыхароў названага рэгіёна (Bosak ì Bosak, 2006, m. 146). Акрамя таго, найменне *капа́* шырока бытуе ў гаворках беларускага і ўкраінскага Палесся (Vygonnaâ, 1968, s. 106), што пацвярджаецца і нашымі запісамі, зробленымі падчас нядаўніх палявых экспедыцый. Слова *коп'і́ца* (*куп'і́ца, купы́ца, копы́ца копы́ц'а* і пад.) адзначана і на тэрыторыі Польшчы, у гаворках наваколля Уладавы, што мяжуюць, сярод іншага, з гаворкамі Брэсцкай вобласці Беларусі (Czyżewski, 1986, m. 78).

'Круглы калодачны вулей для пчол' у гаворках Брэсцкай вобласці называецца *кало́да (коло́да).* І толькі на поўдні, у арэале гаворак з оканнем, а таксама ў адзінкавых паселішчах Ляхавіцкага раёна (вв. Старыя Буды і Меляхі) зафіксавана лексема *ка́даўп (ка́доўб)* (Čarnâkevìč, 2009, m. 222). Як сведчаць ранейшыя даследаванні, лексема *кало́да* бытуе ў гаворках жыхароў цэнтральнай Беларусі, а таксама ў некаторых гаворках заходняй часткі краіны. Назва *ка́даўб* зафіксавана ў маўленні вясковых жыхароў Бярозаўскага, Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў, г.зн. толькі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці (*Leksìčny atlas…*, 1993–1998, t. 1, m. 306), што пацвярджаецца і сабраным намі матэрыялам. Да таго ж, паводле даных *Атласа ўкраінскай мовы*, у суседніх гаворках Валынскай вобласці Украіны бытуе пераважна лексема *ка́дуб*, а ў гаворках Ровенскай вобласці – *ка́доб* (*ка́доўб*) (*Atlas ukraïns'koï movi…*, 1984–2001, t. 2, m. 54). Акрамя таго, згодна з матэрыяламі Міколы Ніканчука, лексема *калода* 'вулей' выкарыстоўваецца на ўсёй тэрыторыі Ніжняй Прыпяці (Украіна і Беларусь), а слова *ка́даўп (ка́доўб)* сустракаецца даволі рэдка на поўдні даследаванага ім рэгіёна (Nikončuk, 1994, m. 134).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



### Такім чынам, можна зрабіць пэўныя высновы:

1) Прыведзеныя моўныя факты сведчаць пра тое, што ў маўленні жыхароў Брэсцкай вобласці Беларусі і сёння можна адшукаць адметныя лексемы, звязаныя з сельскай і хатняй гаспадаркай.
2) Адзначаныя на тэрыторыі Брэсцкай вобласці словы, якія ўводзяцца ў навуковы ўжытак упершыню (*градóк, в'ішáк, л'íштвачка, кошэ́л', полотн'íк, латны́к* і інш.), яшчэ раз пацвярджаюць высновы як айчынных, так і замежных навукоўцаў пра моўнае багацце даследаванага рэгіёна (ды і ўсяго Палесся).
3) Фіксацыя шматлікіх адметных лексем, часам даволі адрозных ад тых, якія бытуюць у сучаснай беларускай літаратурнай мове, – лагічны і заканамерны вынік сучасных палявых даследаванняў айчынных дыялектолагаў. Гэта яшчэ раз сведчыць пра значэнне падобных экспедыцый у вясковыя паселішчы, асабліва ў тыя, мова якіх яшчэ не была прадметам аналізу ні па праграме *Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы*, ні па праграме *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак*.
4) Лексемы, зафіксаваныя ўпершыню ў гаворках Брэсцкай вобласці (і іншых рэгіёнаў Беларусі), павінны ўвайсці ў дыялектныя слоўнікі, а тэксты, у якіх яны ўжываюцца, – у дыялектны падраздзел тэкставых корпусаў беларускай мовы, і гэтым самым значна пашырыць факталагічную базу славянскай дыялекталагічнай навукі.
5) Матэрыялы беларускіх рэгіянальных атласаў, а таксама, у некаторых выпадках, замежных дыялекталагічных атласаў (польскіх і ўкраінскіх), параўн. *с'энакóс - касав'íца - каз'бá*, значна ўдакладняюць даныя, атрыманыя ранейшымі даследчыкамі (напрыклад, збіральнікамі звестак для *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак*) на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Таму для паспяховага развіцця айчыннай дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі неабходна, сярод іншага, далейшае стварэнне і выданне айчынных рэгіянальных атласаў, а таксама больш шырокае выкарыстанне замежных лінгвагеаграфічных прац, у якіх змяшчаюцца звесткі з гаворак Беларусі, пры аналізе беларускага дыялектнага матэрыялу.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

*Atlas ukraïns'koï movi: u 3 t*. Ì. Matvìâs [ta ìn.]. (red.). (1984–2001). Kiïv: Naukova dumka *[Атлас української мови: у 3 т*. І. Матвіяс [та ін.] (ред.). (1984–2001). Київ: Наукова думка].

Bosak, Alëna; Bosak,Vìktar. (2006). *Atlas gavorak Pružanskaga raëna Brèsckaj voblascì ì sumežža (Verhnâga Nad`âsel'dzâ): leksìka*. Rèd. F. Klìmčuk. Mìnsk: ÌVC Mìnfina. [Босак, Алёна; Босак, Віктар. (2006). *Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя): лексіка*. Рэд. Ф. Клімчук. Мінск: ІВЦ Мінфіна].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



Čarnâkevìč, Ûryj. (2009). *Atlas gavorak paŭnočna-ŭschodniaj Brestčyny*. Mìnsk: Tèhnalogìâ. [Чарнякевіч, Юрый. (2009). *Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*. Мінск: Тэхналогія].

Czyżewski, Feliks. (1986). *Atlas gwar polskich i ukraińskich okolic Włodawy*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Klìmčuk, Fëdar; Âškìn, Ìvan. (1976). Z leksìkì Vyganaŭskaga Palessâ (v. Gortal′ Ìvacèvìckaga raëna). U: A. Bahan′koŭ (red.). *Narodnae slova* (s. 76–82). Mìnsk: Akad. navuk BSSR, Ìn-t movaznaŭstva [Клімчук, Фёдар; Яшкін, Іван. (1976). З лексікі Выганаўскага Палесся (в. Горталь Івацэвіцкага раёна). У: А. Баханькоў (рэд.). *Народнае слова* (с. 76–82). Мінск: Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства].

Kryvìckì, Alâksandr. (1994). Paŭdnëva-zahodnì dyâlekt. U: A. Mìhnevìč (red.). *Belaruskaâ mova: èncyklapedyâ* (s. 415–417). Mìnsk: Belarus. Èncykl. [Крывіцкі, Аляксандр. (1994). Паўднёва-заходні дыялект. У: А. Міхневіч (рэд.). Беларуская мова: энцыклапедыя (с. 415–417). Мінск: Беларус. Энцыкл.].

*Leksìčny atlas belaruskìh narodnyh gavorak: u 5 t*. Rèd. M. V. Bìryla ì Û. F. Mackevìč. Mìnsk: Fond fundament. dasled. Rèsp. Belarus′, 1993–1998. [Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5 т. Рэд. М. В. Бірыла і Ю. Ф. Мацкевіч. Мінск: Фонд фундамент. даслед. Рэсп. Беларусь, 1993–1998].

Levancèvìč, Lena. (1993–2001). *Atlas gavorak Bârozaŭskaga raëna Brèsckaj voblascì: u 3 č*. Brèst : Brèst: Brèsc. dzârž. un-t. [Леванцэвіч, Лена. (1993–2001). *Атлас гаворак Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці: у 3 ч*. Брэст : Брэсц. дзярж. пед. ін-т].

Nikončuk, Mikola. (1994). *Leksični atlas pravoberežnogo Polìssâ = The lexical atlas of rightcoastal Polissja.* Kiïv: Nezalež. ìnst. ekologìï Polìssâ [Никончук, Микола. (1994). *Лексични атлас правобережного Полісся = The lexical atlas of rightcoastal Polissja*. Київ: Незалеж. інст. екології Полісся].

Šatalava, Lûboŭ. (1975). *Belaruskae dyâlektnae slova*. Red. G. U. Arašonkava. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Шаталава, Любоў. (1975). *Беларускае дыялектнае слова*. Рэд. Г. У. Арашонкава. Мінск: Навука і тэхніка].

Sen′kavec, Uladzìmìr. (2011). *Karotkì dyâlektny sloŭnìk v. Belavuša Stolìnskaga raëna*. U: *Moŭnakul'turnaâ prastora Brèscka-Pìnskaga Palessâ: zb. navuk. art. u 2 č*. Red. M. M. Alâhnovìč [ì ìnš.]. Č. 1 (s. 108–123). Brèst: Brèsc. dzârž. un-t. [Сенькавец, Уладзімір. (2011). Кароткі дыялектны слоўнік в. Белавуша Столінскага раёна. У: Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся: зб. навук. арт. у 2 ч. Рэд. М. М. Аляхновіч [і інш.]. Ч. 1 (с. 108–123). Брэст: Брэсц. дзярж. ун-т].

Stankevìč, Alâksandra. (1997). *Leksìka ìnšamoŭnaga pahodžannâ ŭ belaruskìh narodnyh gavorkah: dys. d-ra filal. navuk : 10.02.01.* Gomel′ (na pravah rukapìsu). [Станкевіч, Аляксандра. (1997). *Лексіка іншамоўнага паходжання ў беларускіх народных гаворках: дыс. д-ра філал. навук: 10.02.01*. Гомель (на правах рукапісу)].

Veštart, Galìna (ukl. [ì ìnš. ]). (2008). *Leksìka gavorak Belaruskaga Prypâckaga Palessâ: atlas, sloŭnìk*. Red. F. Klìmčuk, U. Koščanka, Ì. Lapuckaâ. Mìnsk: Prava ì èkanomìka. [Вештарт, Галіна (укл. [і інш. ]). (2008). *Лексіка гаворак Беларускага Прыпяцкага Палесся: атлас, слоўнік*. Рэд. Ф. Клімчук, У. Кошчанка, І. Лапуцкая. Мінск: Права і эканоміка].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/05/2026 11:31:04



Vygonnaâ, Lìlìâ. (1968). Polesskaâ zemledel′českaâ terminologiâ. W: N. Tolstoj (red.). *Leksika Poles'â. Materialy dlâ polesskogo dialektnogo slovarâ* (s. 93–130). Moskva: Izdatel′stvo Nauka. [Выгонная, Лілія. (1968). *Полесская земледельческая терминология*. В: Н. Толстой (рэд.). *Лексика Полесья. Материалы для полесского диалектного словаря* (с. 93–130). Москва: Издательство Наука].

SUBMITTED: 22.09.2020
ACCEPTED: 21.05.2021
PUBLISHED ONLINE: 12.12.2021

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Yury Charnyakievich / Юрый Чарнякевіч** – Białoruś, Mińsk, Białoruski Państwowy Uniwersytet Pedagogiczny im. Maksima Tanka, Wydział Filologiczny, Katedra Językoznawstwa i Lingwodydaktyki; dr, doc.; spec.: językoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: dialektologia białoruska i słowiańska, lingwogeografia białoruska i słowiańska, kultura języka białoruskiego.

Adres: Філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Рэспубліка Беларусь, 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18

Wybrane publikacje:

1. Юрый Чарнякевіч. (2020). Выбраная лексіка, звязаная з будаўніцтвам, у дыялектнай мове жыхароў заходняга Палесся Беларусі і Украіны. W: Mirosław Jankowiak, Michal Vašíček (red.). *Slovanské dialekty v jazykovém kontaktu. Nářeční lexikum v pomezních oblastech v minulosti a současnosti* (s. 177–185). Praha: Slovanský ústav AV ČR.
2. Юрый Чарнякевіч. (2018). Мовазнаўчая спадчына польскага дыялектолага Ю. Тарнацкага і сучасныя беларускія рэгіянальныя лінгвагеаграфічныя даследаванні. W: Ірына Багдановіч [і інш.]. (рэд.). *Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: зб. навук. арт* (с. 301–312). Мінск: БДУ.
3. Юрый Чарнякевіч. (2017). *Агульнасць і арэальная дыферэнцыяцыя беларускіх пераходных гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*. Дысертацыя... кандыдата філалагічных навук: 10.02.01: абаронена 10.03.2017: зацверджана 07.06.2017. Мінск (na prawach rękopisu).
4. Юрый Чарнякевіч. (2009). *Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны*. Мінск: Тэхналогія.
5. Юрый Чарнякевіч. (2009). Лексічныя асаблівасці гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны. *Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук*, 2, с. 109–112.